# Белтэлекам 9 мая прадаставіць інвалідам і ўдзельнікам ВАВ бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы і падаўжае тэрмін дзеяння акцыі «Дзень Перамогі з ZALA»

Традыцыйна **9 мая РУП «Белтэлекам» прадаставіць інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы (званкі па Рэспубліцы Беларусь).**

Бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы прадастаўляюцца ў перыяд з 00.00 гадзін 09.05.2018 да 24.00 гадзін 09.05.2018 аўтаматычным спосабам або з дапамогай тэлефаніста з кватэрных тэлефонаў, абанентамі якіх з'яўляюцца наступныя фізічныя асобы:

- Героі Савецкага Саюза;
- поўныя кавалеры ордэна Славы;
- інваліды Вялікай Айчыннай вайны;
- удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны;
- асобы, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943-1945 гадах;
- асобы, якія ўзнагароджаны ордэнамі і (або) медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны;
- асобы, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог;
- члены экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрніраваных у пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў партах іншых дзяржаў;
- асобы, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаныя медалём "За абарону Ленінграда", і асобы, узнагароджаныя знакам "Жыхару блакаднага Ленінграда";
- інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (мужчыны - 61 гады, жанчыны - 56 гадоў).

Каб ажыццявіць бясплатны званок, трэба набраць нумар выклікаемага абанента самастойна або заказаць тэлефонную размову з кватэрнага тэлефона з дапамогай тэлефаніста. Заказ бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў з 00.00 09.05.2018 да 24.00 09.05.2018 па тэлефонах ажыццяўляецца:

- для абанентаў г. Брэст і Брэсцкая вобласць - 8-18;
- для абанентаў г. Віцебск і Віцебская вобласць - 8-18;
- для абанентаў г. Гомель і Гомельская вобласць - 8-13;
- для абанентаў г. Гродна і Гродзенскай вобласці - 8-13;
- для абанентаў г. Мінск і Мінская вобласць - 8-13, 8-18;
- для абанентаў г. Магілёў і Магілёўская вобласць - 8-18.

Даведкі па прадастаўленні бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў прадастаўляюцца па тэлефоне даведачна-Адзінай інфармацыйнай службы 153.

Умовы акцыі не распаўсюджваюцца на размовы з абанентамі сотавых рухомых сетак, на доступ у сетку Інтэрнэт і карыстанне платнымі даведачна-інфармацыйнымі службамі, арганізаванымі па міжгародннім прынцыпе.

Па традыцыі «Белтэлекам» **штогод падаўжае тэрмін дзеяння акцыі для інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны «Дзень Перамогі з ZALA».**
У рамках акцыі інваліды і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны могуць бясплатна далучыцца да базавага пакета «Стандарт ТБ» эфірнага ТБ ZALA і да базавага пакета "Прэм'ера" інтэрактыўнага ТБ ZALA і карыстацца паслугай без абаненцкай платы.
Адзначым, што ў выпадку адсутнасці ў абанентаў прыёмных антэн для падлучэння да тарыфнага плану «Стандарт ТБ» эфірнага тэлебачання ZALA кампанія «Белтэлекам» бясплатна прадастаўляе і ўстанаўлівае эфірныя дэцыметровыя антэны на час карыстання паслугай.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/08-05-2018-3040*